# КРЫВІЯ

**Выданьне беларускае дыяспары ў Чэхіі**

**№12 Сьнежань 2008 - Люты 2009**

**Культурна-асьветніцкая газэта**

**Беларуская Чэхія**

## ЗЬМЕСТ

**Беларуская Чэхія**
Віншуем нашых студэнтаў - ст. **1**
Сустрэча з Алесем Міхалевічам - ст. **2**
Беларуская бібліятэка ў Празе - ст. **2**
**Навіны з Бацькаўшчыны**
Пытаньне беларускай АЭС - ст. **2**
Эўрапэйская кааліцыя
падае руку ўладзе - ст. **3**
Рух “За Свабоду“ зарэгістравалі - ст. **4**
5-ты Зьезд Беларусаў Сьвету - ст. **4**
Прэс-рэліз “Маладое Беларусі” - ст. **5**
Крызіс у лясной гаспадарцы - ст. **5**
Саміт Юшчанка-Лукашэнка - ст. **6**
**Спорт**
Азаранка ў 1/8 фінале
Australian Open - ст.**5**
**Культура й Гісторыя**
Праз пяць год... беларускія школы
зьнікнуць цалкам - ст.**7**
Рэдактары незалежных мэдыяў:
“З намі гуляюць, як зь лялькамі” - ст.**7**
Беларуская гісторыя па-летувіску - ст.**8**
Студэнты стварылі электронную
энцыкляпэдыю Беларусі - ст.**8**
Дамоўленасьць аб пашырэньні
ўжытку беларускай мовы
на тэлебачаньні - ст. **12**
**Беларусы Эўразьвязу**
Беларусь у Познані - ст. **9**
“Галярэя Ады” у Вільні - ст.**10**
Упяршыню - Дзяды ў Швэцыі - ст. **10**
Чэская паэзія ў перакладах
Віталя Воранава - ст. **11**

## ВІНШУЕМ нашых студэнтаў з дыплёмамі!

* **Алеся Судлянкова** з дыплёмам магістра ў галіне міжнароднага гандлю (у лістападзе 2008, на факультэце міжнародных дачыненьняў пры VŠE ў Празе). Тэма ягонай дысэртацыі: “Ядзерная энэргетыка ў сьвеце - засяроджаньне на Расею”

* **Ганну Васілевіч** з дыплёмам магістра ў галіне міжнародных дачыненьняў і дыпляматыі (у чэрвені 2008, на Англа-Амэрыканскім Унівэрсытэце ў Празе). Тэма ейнае дысэртацыі: “Беларусь між Летувой, Польшчай і Расеяй: нацыянальная тоеснасьць у палітыцы.”

* **Ніну Скеп’ян** з дыплёмам доктара гістарычных навук ( у красавіку 2008, на БДУ ў Менску). Ніна абараніла дысэртацыю на тэму “Інстытут канцлерства ў дзяржаўна-палітычным жыцьці ВКЛ у канцы 15 -- першай палове 16 стагодзьдзяў”

## ПАДЗЯКА

Рэдакцыя выказвае шчырую падзяку
сп. **Арцёму Шчацько**
за фінансавую дапамогу пры раздрукаваньні
гэтага нумару газэты.

## Чарговае “Беларускае Піва” Сустрэча з Алесем Міхалевічам

Сустрэча адбылася 19-га студзеня 2009 г.

Алесь Міхалевіч - малады беларускі апазіцыйны палітык, былы намесьнік старшыні партыі БНФ. Ён актыўна супрацуе з рэгіянальнымі дэмакратычымі арганізацыямі, а апошнім часам таксама зь незалежнымі прафсаюзамі.

У 2008 г. Алесь быў пазбаўлены сяброўства ў партыі БНФ. Новым старшынём партыі быў абраны Др. Лявон Баршчэўскі, які нядаўна выразіў жаданьне пайсьці ў адстаўку - каб магчы кандыдаваць у наступных прэзыдэнцкіх выбарах у 2011 г.

Калі ўдасца Алесю стаць зноў сябрам партыі , дык у наступных нутрана-партыйных выбарах ён зьбіраецца кандыдаваць на старшынства партыі.



Алесь Міхалевіч

Штомесячныя спатканьні “Беларускае Піва” ладзіць арганізацыя **Грамадзянская Беларусь (Občanské Bělorusko)**

---

## Беларуская бібліятэка ў новым памешканьні

Дзеля фінансавых цяжкасьцяў беларуская грамада Прагі была змушаная спыніць у канцы лютага г.г. дзейнасьць Клюбоўні на вул. Соўкеніцкай.

Найбольш каштоўны інвэнтар Клюбоўні -- беларуская бібліятэка, будзе перавезена на новы адрас: ul. Ostrovského 253/3, 150 00 Praha 5.

На новым месцы бібліятэка пачне працаваць ад 1 сакавіка 2009 г.

На колькі гэта будзе магчыма, кіраўніцтва біблятэкі забясьпечыць усе дадатковыя функцыі былой клюбоўні: карыстаньне камп’ютарам, агляданьне дыскаў DVD і пад.

**ЯК ДАЕХАЦЬ** да бібліятэкі:
- найпрасьцей лініяй мэтро **B** да станцыі **Anděl.** Выйсьці праз выхад азначаны **Jinonice-Košiře**. Выйшаўшы з станцыі, знойдзеце з правага боку сходы, азначаныя **Zenské domovy.** Выйшаўшы па іх наверх, ідзеце 50 м. паводля далучанай мапкі.
Дакладна: **3-ці паверх, пакой № 699.**




# НАВІНЫ з Бацькаўшчыны

## Беларускую АЭС хочуць будаваць на мяжы з Эўразьвязам

Нацыянальная Акадэмія навук (НАН) і Міністэрства энэргетыкі сыходзяцца ў меркаваньні: першую беларускую атамную электрастанцыю (АЭС) трэба будаваць на Гарадзеншчыне.

Такая пазыцыя агучаная ў часе працы Беларускага энэргетычнага і экалягічнага форуму. Кукшынаўская і Краснапалянская пляцоўкі будуць трымаць у якасьці рэзэрву, пакуль не пачнецца будоўля. Пляцоўку ў Верхнядзьвінскім раёне забракавалі раней. Паказальна, што Астравецкая пляцоўка, якая знаходзіцца за 20 кілямэтраў ад літоўскай мяжы, пакуль найменей вывучаная.

Выбар Астравецкай пляцоўкі, пра які падчас форуму гаварылі старшыня прэзыдыюму НАН Міхаіл Мясьніковіч і намесьнік міністра энэргетыкі Міхаіл Міхадзюк, экспэртам падаецца найбольш спрэчным. Участак паміж вёскамі Гоза і Міхалішкі, адрозна ад схаваных паміж балотамі пляцовак на Магілёўшчыне, знаходзіцца ў густа заселеных мясьцінах: да Астраўца — 18 кілямэтраў, да Вільні — 50, да Менску — 130. У непасрэднай блізіні — багатая экасыстэма: да ракі Віліі 6 кілямэтраў, да Сарачанскіх азёраў — 14, да Сьвіры — 19, да Нарачы — 40. Эколягаў непакоіць, што, згодна з рашэньнем? могільнік для доўгатэрміновага захоўваньня радыёактыўных адкідаў мяркуецца стварыць у радыюсе 30 км ад будучай АЭС. І ўжо зусім асобная размова пра суседзтва патэнцыйнай АЭС з Эўразьвязам — да літоўскай мяжы ўсяго 20 кілямэтраў.

Па іроніі лёсу, будаваць АЭС зьбіраюцца на радзіме Юрыя Бандажэўскага — экс-рэктара Гомельскага мэдычнага інстытуту, навукоўца, які прысьвяціў жыцьцё дасьледаваньню ўплыву на здароўе чалавека малых дозаў радыяцыі. Свой арышт у 1999 годзе прафэсар Бандажэўскі зьвязвае з крытыкай на адрас беларускіх уладаў за бязьдзеяньне ў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Пасьля амністыі ў 2005 годзе ён зьехаў у Францыю, дзе працягваў займацца навукай. А днямі зарэгістраваў у Літве грамадзкі рух у абарону рэпрэсаваных у Беларусі.

Навіну пра прыярытэт Астравецкай пляцоўкі перад іншымі ён называе працягам “бессыстэмнасьці” ў працэсе пабудовы АЭС. На яго думку, глябальныя пытаньні, якія тычацца лёсу народу, павінны вырашацца праз рэфэрэндум — што было ў Літве, калі вырашалася будучыня Ігналіны:

**Юры Бандажэўскі**

“Я не магу зразумець: чыноўнікі і міністры адразу гавораць з упэўненасьцю пра адно месца, неўзабаве пачынаюцца размовы пра іншае месца. Дык гэта ж прыкмета, гэта дыягназ, сымптом чаго? Перадусім таго, што яны ня ведаюць, што робяць і што ўрэшце

хочуць зрабіць. Тут перадусім трэба вызначыцца: дзеля чаго ўсё гэта пачынаецца. Бо французы адмовіліся, амэрыканцы зь японцамі адмовіліся ўдзельнічаць у гэтай будоўлі стагодзьдзя. Дык вызначце спачатку свае пазыцыі з народам, ня трэба сьпяшацца, а то потым такога наробіце, што будзе немагчыма адкруціць назад”.

На пачатковым этапе разглядаліся некалькі варыянтаў міждзяржаўнага супрацоўніцтва для пабудовы АЭС. Міністэрства энэргетыкі накіравала прапановы франка-нямецкай кампаніі “AREVA”, японa-амэрыканскай “Westinghouse-Toshiba” і расейскаму “Росатому”. Кітайская Гуандунская ядзерна-энэргетычная кампанія прапанавала свае паслугі сама. Аднак пасьля ўзгадненьня пазыцый бакоў, як заявіў намесьнік генэральнага дырэктара Аб’яднанага інстытуту ядзерных і энэргетычных дасьледаваньняў Мікалай Груша, асноўная барацьба, відаць, разгорнецца паміж расейцамі і кітайцамі.

Большасьць экспэртаў пры гэтым лічыць, што ўрэшце Беларусь “закальцуе” сябе на сыравіннай залежнасьці ад Расеі. Сьведчаньнем таму — нядаўняя паездка прэм’ер-міністра Сяргея Сідорскага на Балакаўскую АЭС у Саратаўскай вобласьці. Там знаходзіцца навучальна-трэніровачны цэнтар, дзе стажыруюцца расейскія спэцыялісты, прадстаўнікі Ірану, Кітаю, Індыі. Магчыма, і беларускія кадры атрымаюць адпаведныя веды таксама там. Фізык-ядзершчык, колішні сябра ўрадавай камісіі ў пытаньнях будаўніцтва АЭС Георгій Лепін больш за 20 гадоў вывучае наступствы аварыі на ЧАЭС і сам 6 гадоў адпрацаваў на станцыі. На расейскі вэктар ён глядзіць гэтак:

“Ну вось выходзіць на першы плян Расея. А ў Расеі няма ўрану, няма паліва. Яна нават для сябе ня можа яго закупіць. Бо краіны, дзе яна яго набывала, ня вельмі зараз рвуцца прадаваць уран. То бок можа атрымацца так, што праз нейкі час гэтая сыравіна стане настолькі дэфіцытнай, што проста бессэнсоўна будзе штосьці будаваць. У Расеі хапае адпрацаванага паліва, але гэта “ўзбагачанае паліва”. Яно для такога кшталту рэактараў не пасуе. Гэтыя рэактары працуюць на паліве з узбагачэньнем парадку 4%, а там значна больш. І расейцы проста ўвесь час вядуць размовы пра тое, што яго можна пераўтвараць у паліва для рэактараў. Іншымі словамі, альбо разбаўляць чымсьці, альбо будаваць рэактары на хуткіх нэўтронах. Але рэктары на хуткіх нэўтронах ніхто ў сьвеце не будуе, апроч Расеі, якая толькі спрабуе. А колькі спрабавалі, збудавалі ў сьвеце ўсяго 11, дык 5 нават не запусьцілі”.

Аналітыкі прагназуюць, што папярэдняе рашэньне будаваць АЭС у Астравецкім раёне выкліча рэзка нэгатыўную рэакцыю на Захадзе. Па словах Юрыя Банджэўскага, Эўропа паступова адмаўляецца ад атамнай энэргетыкі, і пэрспэктыва атрымаць пад бокам такое суседзтва захапленьня ня выкліча:

“Гэта ўвогуле абсурд. Я не магу казаць, наколькі гэта асэнсаваны выклік міжнароднай супольнасьці, але гэта сапраўды экстраардынарная. Кідаюцца па ўсёй краіне і ня ведаюць, што рабіць.

**Прапанова:**

Калі ёсьць жаданьне толькі здавацца экстраардынарным — дык гэта адно. А калі рабіць так, як патрэбна — гэта зусім іншае! Давайце спэцэфэкты прыбяром і будзем працаваць. Наша канфэрэнцыя, мы ўсе прапануем разабрацца ў пытаньні. Ніхто ні на кога не “накатвае”, проста трэба ўсім разумным сілам у Беларусі сесьці за стол і разабрацца. Паколькі сур’ёзнае пытаньне, неабходна сур’ёзнае абмеркаваньне; няхай гэта будзе нават дыскусія, ае баяцца ня трэба. Вы заўважце: два гады пра гэта гавораць і колькі ўжо на словах месцаў зьмянілі? Чацьвёртая пляцоўка ўжо! Кідаюцца па ўсёй краіне і ня ведаюць, што рабіць. Калі сёньня наконт Астраўца хтосьці такое заяўляе як магчымую гіпотэзу, значыць, структуры, адказныя за гэта, ня ў стане вырашаць такія важныя пытаньні”.

Катлаван пад першую ў Беларусі АЭС мяркуюць пачаць капаць ужо праз год, пры канцы 2009-га. Увод першага энэргаблёку заплянаваны на 2016 год, другога — на 2018-ты. Кошт рэалізацыі праекту, паводле розных ацэнак, вагаецца ад 5 да 10 мільярдаў даляраў.

**Ігар Карней,**
Радыё Свабода, 16.10.2008

## Эўрапейская кааліцыя падае руку ўладзе

Каардынатары Эўрапейскай кааліцыі прапанавалі ўладам плян нацыянальнага прымірэньня дзеля будучыні Беларусі.

Каардынатары Мікола Статкевіч, Вячаслаў Сіўчык, Уладзімер Навасяд і Зьміцер Дашкевіч прэзэнтавалі сёньня на прэсавай канфэрэнцыі ў сядзібе БНФ плян нацыянальнага прымірэньня. Ён уключае па пяць абавязаньняў, якія маюць супольна ўзяць на сябе, з аднаго боку, улады, а з другога — дэмакратычная апазыцыя.

**Мікола Статкевіч:** “Мы сёньня ўладзе прапануем выбар. Мы гатовыя даць гарантыі прымірэньня, што мы ня будзем помсьціць, перасьледаваць вас, ня

…ня будзем карыстацца тым, што, магчыма, падчас крызісу людзі будуць масава пратэставаць

будзем карыстацца тым, што, магчыма, падчас крызісу людзі будуць масава пратэставаць. Але ўлада таксама павінна зрабіць рэальныя крокі да дэмакратыі”.

Паводле пляну, улады павінны

* скасаваць “палітычныя” артыкулы крымінальнага кодэксу,
* зьняць судзімасьць з палітвязьняў,
* спрасьціць працу мэдыяў,
* унесьці зьмены ў выбарчае заканадаўства,
* правесьці датэрміновыя мясцовыя выбары,
* рэфармаваць эканоміку і
* даць магчымасьць вольнага выкарыстаньня бел-чырвона-белага сьцягу і гербу “Пагоня”.

Калі ўлады праігнаруюць плян, то ўвесну Эўрапейская кааліцыя агучыць іншы, у якім ужо ня будуць прадугледжвацца ўдзел улады і гарантыі для яе.

Каардынатары Эўрапейскай кааліцыі заявілі, што іх хвалюе сытуацыя, зьвязаная з эканамічным крызісам,

Маўляў, прыйдуць дэмакраты, усё забяруць і пасадзяць, але найбольш тое, як зь яго выходзіць краіна.

**Мікола Статкевіч:** "Безумоўна, зараз патрэбныя грошы. Шукаюць на Захадзе, імітуючы дэмакратыю. Але пры імітацыі, безумоўна, лёгка зразумець, што вялікіх грошай Захаду ня будзе. Чаму імітуюць — бо баяцца дэмакратыі. Маўляў, прыйдуць дэмакраты, усё забяруць і пасадзяць, як яны разважаюць. Застаецца адно выйсьце — у Расеі. А Расея грошы за так не дае. Прыйдзецца плаціць нацыянальнай эканомікай, сувэрэнітэтам. Ніхто ня ведае, чым паабяцаў Лукашэнка заплаціць за тое, што пакінуты сёлетнія кошты на газ".

**Зьміцер Дашкевіч:** "Размовы пра неабходнасьць ці непатрэбнасьць дыялёгу цяпер ужо непатрэбныя. На вялікі жаль, незалежна ад нас, гэтая гульня ідзе. І наша задача ў 2009 годзе — зрабіць усё магчымае, каб гэты працэс дэмакратызацыі краіны, пэўнай лібэралізацыі, якая ўсё ж у пэўных межах назіраецца, быў альбо сапраўдным працэсам, які прыносіў бы карысьць грамадзтву, — альбо каб гэты гандаль каштоўнасьцямі дэмакратыі і свабоды спыніўся. І прынамсі мы зробім дзеля гэтага ўсё магчымае".

**Уладзімер Навасяд:** заявіў, што ў Беларусі сёньня неабходны рэжым жорсткай эканоміі. Ён прааналізаваў некаторыя лічбы, якія закладзеныя ў бюджэт 2009 году. Так, дзяржаўныя органы агульнага прызначэньня вызначылі сабе памер фінансаваньня — каля 411 мільёнаў даляраў.

"Гэта на 40% больш, чым у папярэднім годзе. Парлямэнт сабе асыгнаваў 15 мільёнаў даляраў. Ён павялічыў асыгнаваньні на заробкі сакратарыяту і дэпутацкага корпусу на 36%. Прычым 2007-ы — год пад'ёму эканомікі — суправаджаўся падвышэньнем заробкаў на 12%. Узьнікае пытаньне — для каго ствараюць падушку бясьпекі? Дзе плян антыкрызысных захадаў?"

**Вячаслаў Сіўчык:** Спадар Навасяд прапанаваў арганізаваць парлямэнцкія слуханьні па рэальнай сытуацыі ў эканоміцы і выпрацаваць агульную праграму выхаду з крызісу, у рэалізацыі якой возьмуць удзел і дэмсілы.

Вячаслаў Сіўчык заклікаў увесьці мараторый на прэзыдэнцкія ўказы, якія "зьнішчаюць індывідуальных прадпрымальнікаў". Таксама ён адзначыў, што ўсе пляны ўладаў па прыватызацыі без удзелу дэмакратычнай грамадзкасьці "падвісаюць у будучыні".

**Крыніца:** Хартыя 97, 23 сьнежня 2008

## Рух "За Свабоду" зарэгістравалі!

Міністэрства юстыцыі зарэгістравала праваабарончаасветніцкае грамадскае аб'яднанне "Рух За Свабоду".

– Я лічу, што рэгістрацыя аб'яднання - лагічны крок з боку ўладаў, таму што юрыдычных падстаў для нерэгістрацыі ні раней, ні цяпер не было. Спадзяемся, што гэта не апошні выпадак рэгістрацыі недзяржаўных аб'яднанняў, - паведаміў намеснік кіраўніка "Руху За Свабоду" Юрась Губарэвіч.

Нагадаем, заснавальнікі грамадскага аб'яднання "Рух "За Свабоду" спрабавалі зарэгістраваць арганізацыю чатыры разы.

*Прэс-служба* info@milinkevich.org

---

## V Зьезд беларусаў сьвету МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" адбудзецца ў ліпені 2009 г. у Мінску

18 лістапада адбылося пасяджэнне Малой Рады МГА "Згуртаваньне беларусаў свету "Бацькаўшчына", асноўным пытаньнем, якога была падрыхтоўка да V зьезду беларусаў сьвету. Папярэдняя дата правядзеньня зьезду прызначана на 18–19 ліпеня 2009 года, канчаткова дата будзе зацьверджана пасля кансультацыі з сябрамі Вялікай Рады, у якую ўваходзяць кіраўнікі і вядомыя дзеячы беларускіх арганізацый замежжа. Малая Рада, акрамя таго, акрэсьліла тры варыянты тэмы зьезду. Бясспрэчна адно – асноўнай праблематыкай зьезду будзе пытаньне культурнай нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў, праблемы і захады па яе захаваньні, як у метраполіі, так і ў дыяспары. Канчатковая тэма будзе зацьверджана па выніках галасаваня Вялікай Рады. На наступным пасяджэньні Малой Рады МГА "ЗБС "Бацькаўшчына", якое адбудзецца ў студзені 2009 года, плануецца разглядаць праекты складу аргкамітэту па правядзеньні зьезду, рабочых групаў, квотаў на вылучэньне дэлегатаў ды іншыя працоўныя моманты, неабходныя для годнага правядзеньня V зьезду беларусаў сьвету.

Сваімі меркаваньнямі і чаканьнямі ад такой значнай падзеі ў жыцьці беларусаў сьвету для Інфармацыйнага цэнтру "Бацькаўшчыны" падзяліліся некаторыя сябры Малой Рады.

**Леанід Лыч**, доктар гістарычных навук, прафесар: "Чакаю, што наступны зьезд беларусаў сьвету ўлічыць станоўчы досьвед першых такіх форумаў і пройдзе на яшчэ большым і годным узроўні. І пажадана, каб адбылася гаворка, як у міжзьездаўскі перыяд актывізаваць працу ў сферы беларускай культуры…"

**Генадзь Бураўкін**, паэт, грамадскі дзеяч: "Рады, што адбудзецца, бо гэта магчымасьць сустрэцца і абмяняцца думкамі. Праблемы накопліваюцца ўсё больш і больш, і іх трэба абмяркоўваць. Буду рады, калі на зьездзе зьявіцца болей моладзі, бо трэба аддаваць ужо ім перавагу, мы старэем, і нам на зьмену павінна прыходзіць маладое пакаленьне…"

**Алег Гардзіенка**, гісторык, журналіст: "Мне хочацца, каб улады нашай краіны зьвярнулі ўсё ж такі ўвагу на нашу беларускую дыяспару. Каб гэты зьезд меў багатую колькасьць прадстаўнікоў з заходніх краін, бо гэтая колькасьць у асноўным за апошнія часы зьмяншаецца".

*Інфармацыйны цэнтр МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"*

## Прэс-рэліз Руху “Маладая Беларусь”

Актывісты беларускае апазыцыі, прадстаўнікі Руху “Маладая Беларусь” Артур Фінькевіч, Зьміцер Касьяровіч, Цімафей Дранчук, руху “Эўрапейская Беларусь” Алесь Атрошчанкаў, Яўген Афнагель, Павал Юхневіч, а таксама кіраўнік “Моладзі БНФ” Франак Вячорка і фотакарэспандэнт газэты “Наша Ніва” Юлія Дарашкевіч прымаюць ўдзел у шырокай міжнароднай канфэрэнцыі, прысьвечанай 25-й гадавіне атрыманьня Нобелеўскай прэміі Міру заснавальнікам і лідэрам польскай “Салідарнасьці”, былым прэзыдэнтам Польшчы Лехам Валенсам.

З 1 сьнежня актывісты апазыцыі знаходзяцца ў Польшчы ў складзе больш чым 200 прадстаўнікоў з усяго сьвету. Падчас праграмы “Экспрэс Салідарнасьці” актывісты наведалі Кракаў і канцэнтрацыйны нацысцкі лягер “Асьвенцым”, на цягніку “Экспрэс Салідарнасьці” наведалі Варшаву, і зараз знаходзяцца ў Гданьску, дзе адбываецца заключная частка праграмы – “Моладзевы Форум”.

Актывісты апазыцыі сустрэліся на форуме з такімі знакамітымі людзьмі, якія атрымлівалі Нобеўскую прэмію Міру, як сам Лех Валенса, духоўны лідэр Тыбету Далай Лама 14-ы, былы прэзыдэнт Паўночна-Афрыканскае Рэспублікі Фрэдэрык Вілем Дэ Клерк, іранская праваабаронца Шрын Эбаді ды іншыя.

У сваім выступе лідэр тыбецкага супраціву Далай Лама 14-ы выказаў надзею, што моладзь, якая прысутнічае на форуме, абавязкова дасягне міру ў сваіх краінах. Таксама Далай Лама 14-ы адзначыў, што салідарнасьць ёсьць адным з галоўных чыньнікаў посьпеху ў змаганьні за свабоду і справядлівасьць.

Апошні дзень моладзевага форуму 6 сьнежня, дзе заяўленыя таксама такія госьці, як прзыдэнт Францыі Нікаля Сарказі, кіраўнік Эўракамісіі Жозэ Мануэл Баррозу і іншыя вядомыя людзі.

**Прэс-служба**
**Руху “Маладая Беларусь”**
**<u>05.12.2008 г.</u>**

---

## Крызіс у лясной гаспадарцы: Прадукцыя патанела напалову

У выніку сусьветнага эканамічнага крызісу беларуская лясная галіна страціла ля 18 мільёнаў даляраў, а цана на лесаматар’ялы зьнізілася да 40 працэнтаў. Пра гэта паведаміў міністр лясной гаспадаркі Беларусі Пётр Сямашка, падводзячы вынікі мінулага году.

Попыт на беларускія лясныя матар’ялы на Захадзе рэзка ўпаў пры канцы мінулага году. Праз гэта Міністэрства лясной гаспадаркі не далічылася блізу 18 мільёнаў даляраў. Пра гэта заявіў на сустрэчы з журналістамі міністр лясной гаспадаркі Пётр Сямашка.

- Крызіс адбіўся на нас. У кастрычніку-сьнежні мінулага году спажываньне лесаматар’ялаў і прадукцыі лесапілаваньня рэзка ўпала. Хоць унутраны рынак спажыў на 100 працэнтаў, аднак спажыўцы вялікіх аб’ёмаў нашай прадукцыі – Заходняя Эўропа, ЗША, Прыбалтыка, Скандынавія – істотна зьнізілі свае патрэбы. За гэтыя месяцы ў параўнаньні з 2007 годам мы страцілі недзе ля 18 мільёнаў даляраў.

Як паведаміў міністр, кошты на лесапрадукцыю зьнізіліся ажно да 40 працэнтаў, а фанера ды ДСП, што прадукуе канцэрн “Беллесбумпрам” дык наогул патаннела напалову.

- Ад пачатку году цэны на сасновыя балансы зьнізіліся з 45,9 да 27,3 еўра, на яловыя балансы з 68 еўра да 38, на бярозавыя – з 41 да 30,5. Піламатар’ялы мы раней рэалізоваўвалі за 125-135 еўра за куб, а цяпер за 98-100. Да ўсяго, цана на прадукцыю асноўнага спажыўца нашай сыравіны – канцэрну “Беллесбумпром” зьнізілася на 50 і больш працэнтаў. І гэта б’е па галіне лясной гаспадаркі.

Мінлясгас мае намер утрымаць сёлета прынамсі паказьнікі мінулага году ды захаваць сярэдні заробак у сферы лясной гаспадаркі, што складае ля 800 тысячаў рублёў. У прыватнасьці, вядзецца праца, каб збалансаваць кошты на прадукцыю і зрабіць іх плаваючымі. Да ўсяго, міністр паведаміў, што ўжо знойдзена адна зь нішаў на рынку – у прыватнасьці пры канцы году Беларусь пачала экспартаваць ацыліндраваную драўніну, што выкарыстоўваецца пры будаўніцтвае дзіцячых пляцовак, калодзежаў ды альтанак. За паўтара месяца гэтай прадукацыі было прададзена на тры мільёны даляраў, і Мінлясгас плануе сёлета пашырыць яе вытворчасьць.

**Сяргей Будкін,** Радыё Рацыя, Мінск., 15.1.2009

---

## *СПОРТ*

## Азаранка ў 1/8 фінале Australian Open

Сёньня ўначы прайшоў матч 1/8 фіналу Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі па тэнісе паміж беларускай Вікторыяй Азаранкай і амэрыканкай Серэнай Ўільямс (2-гой жаночай ракеткай сьвету, якая пазьней выйграла ўвесь турнір.)



Першы сэт Вікторыя выйграла - 6:3, а ў другім пры ліку 2:4 ўзяла медыцынскі тайм-аўт з прычыны галавакружэньня і праблемаў са страўнікам.

Такім чынам Вікторыя выйграла на Australian Open тры матчы:

у Пэтры Квітавай (Чэхія) - 6:2, 6:1; у прадстаўнічкі Італіі Тацяны Гарбін - 4:1 (Тацяна зьнялася са спаборніцтваў), францужанкі Амелі Марэсмо - 6:4, 6:2.

**Крыніца:** Наша Ніва, 26.1.2009

# Саміт Юшчанка-Лукашэнка: старт для Вышаградскай групы 2.0?

**Момант удалы, сур'ёзнасць можна будзе ацаніць па вырашэнні застарэлай праблемы міждзяржаўнага доўгу.**

Піша **Дзяніс Мельянцоў.**

20 студзеня адбылася двухбаковая сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Ўкраіны, якая планавалася яшчэ з 2007 года, але кожны раз адкладалася з розных прычынаў. Нягледзячы на тое, што пад час гэтае сустрэчы не ўдалося вырашыць усіх праблемаў беларуска-ўкраінскіх адносінаў, яна па праве можа лічыцца лёсавызначальнай для ўсёй Усходняй Еўропы.

Візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Чарнігаў стаў прарыўным не ў сэнсе дасягнутых пагадненняў, але ў сэнсе глыбокага сімвалізму і выразнасці «паслання», у прыватнасці, Крамлю.

Па-першае, гэты візіт рыхтаваўся два гады, і кожны раз яму замінaлі розныя чыннікі, галоўным з якіх быў пат у вырашэнні праблемы ўкраінскага доўгу, праз якую немагчыма было канчаткова закрыць пытанне ўкраінска-беларускай мяжы. Аналітыкі падкрэслівалі, што візіт можа адбыцца толькі тады, калі будзе знойдзена рашэнне праблемы доўгу, або калі ў бакоў з'явіцца палітычная воля заплюшчыць вочы на гэтае пытанне дзеля вырашэння стратэгічных праблемаў. Таму гэтая сустрэча гаворыць пра з'яўленне супольных праблем, якія каштуюць больш за стомільённы доўг.

Па-другое, сустрэча Юшчанкі і Лукашэнкі адбылася не ў адной са сталіц, а ў Чарнігаве, які размешчаны паміж Мінскам і Кіевам.

Па-трэцяе, сустрэча прайшла менавіта 20 студзеня, у дзень інаўгурацыі новага прэзідэнта ЗША. Такім чынам, змена адміністрацыі сімвалізуе і перамены ў рэгіянальнай палітыцы ва Ўсходняй Еўропе.

Па-чацвёртае, візіт адбыўся практычна адразу пасля завяршэння расійска-ўкраінскай газавай вайны, што падкрэслівае ягоную тэматыку і значнасць не толькі для Ўкраіны і Беларусі.

Афіцыйная сустрэча двух лідэраў у Чарнігаве сталася завяршэннем даволі працяглага перыяду ў беларуска-ўкраінскіх адносінах, які распачаўся пасля «Памаранчавай рэвалюцыі» і характарызаваўся інтэнсіфікацыяй гандлю пры агульным нізкім узроўні палітычных кантактаў. На прасторы СНД Украіна і Беларусь займалі супрацьлеглыя палітычныя пазіцыі, аднак на сёння супольныя выклікі прымушаюць Мінск і Кіеў шукаць шляхі каардынацыі сваёй палітыкі.

Сустрэча мела вынікам падпісанне цэлага пакету другасных дакументаў. Значнасць падпісаных дакументаў не патрабавала сустрэчы на вышэйшым узроўні, тым больш што ані пытанне доўгу, ані пытанне мяжы вырашана не было. Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў была важнай сама па сабе, а не ад падпісаных пагадненняў.

Яна дала магчымасць пры зачыненых дзвярах абмеркаваць тыя пытанні, якія пакуль што рана выносіць на паперу, сярод якіх каардынацыя ў межах ініцыятывы «Ўсходняе партнёрства» ЕС, Балта-Чарнаморскі транспартны калідор і нафтаправод «Адэса-Броды».

Факт і змест сустрэчы Юшчанкі і Лукашэнкі ў Чарнігаве дазваляюць зрабіць шэраг высноваў датычных развіцця ўсяго рэгіёну.

1. Беларусь паслядоўна праводзіць палітыку выхаду з міжнароднай ізаляцыі, у тым ліку і праз спробу прыняць удзел у пабудове рэгіянальнага інтэграцыйнага блоку, што падвысіла б яе значнасць як для Расіі, гэтак і для Захаду. Момант для гэтага выбраны ўдала: і агульная міжнародная сітуацыя, і сусветны эканамічны крызіс пашыраюць магчымасці для перафарматавання адносінаў у рэгіёне Ўсходняй Еўропы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка дзейнічае такім чынам, каб прадэманстраваць сваю надзейнасць і дамоваздатнасць як у адносінах з Расіяй, гэтак і ў адносінах з Захадам і Ўкраінай.

2. Палітычнае збліжэнне з Украінай з'яўляецца часткай нармалізацыі адносінаў з Захадам

Пры гэтым Украіна будзе адыгрываць ролю пасярэдніка ў дыялогу паміж Беларуссю з аднаго боку і ЕС і ЗША – з іншага.

3. Наладжванне кантактаў з Украінай сведчыць пра спробы знайсці альтэрнатыўную ЕС і Расіі апору ў рэгіёне.

Пры гэтым сур'ёзнасць намераў усталяваць доўгатэрміновыя палітычныя адносіны з Украінай будуць вымярацца аператыўнасцю вырашэння галоўнага пытання беларуска-ўкраінскіх дачыненняў – пра дзяржаўны доўг.

4. Распачынаецца праца ў накірунку каардынацыі транзітнай палітыкі Беларусі і Ўкраіны,

што ў перспектыве можа стаць магутным інструментам уплыву на палітыку Крамля ў рэгіёне.

5. Пачатак абмеркавання супольных дзеянняў што да ўдзелу ва Ўсходнім партнёрстве ЕС і каардынацыі падыходаў Кіева і Мінска ў стасунках з Еўракамісіяй сведчаць пра магчымасць нараджэння ва Ўсходняй Еўропе другога выдання Вышаградскай групы, мэтай якой, нагадаю, была каардынацыя ўступлення ў Еўрапейскі саюз.

Супольная палітыка Ўкраіны і Беларусі што да ЕС падвысіла б геапалітычную вагу абедзвюх краін у вачах ЕС, а таксама паспрыяла б нармалізацыі стасункаў Беларусі з Брусэлем з перспектывай перагляду стаўлення беларускіх уладаў да інтэграцыі краіны ў Еўрасаюз. Аднак, дзеля таго, каб «Вышаград 2.0» сапраўды паўстаў, Беларусь мусіць выканаць сур'ёзную папярэднюю працу па лібералізацыі ўласнай эканомікі і палітычнай сістэмы.

Паводле **belinstitute.eu**, 26 студзеня 2009

## Праз пяць год, калі нічога ня зьменіцца, беларускія школы зьнікнуць цалкам

Толькі 1,9 % гарадзкіх першаклясьнікаў краіны навучаецца сёлета па-беларуску. Гэта ў 30 разоў менш, чым у 1993-94 навучальным годзе.

У сувязі з такой сытуацыяй Рада Таварыства беларускай мовы заклікала бацькоў, грамадзкіх актывістаў і палітыкаў ужо цяпер заняцца стварэньнем беларускамоўных клясаў і школ для наступнага навучальнага году, перадае «Радыё Свабода».

Хоць навучальны год пачаўся амаль пяць месяцаў таму, міністэрства адукацыі толькі цяпер паведаміла статыстыку па беларускамоўным школьніцтве ў краіне. Прычым зрабіла гэта на неаднаразовы запыт актывістаў беларушчыны. Старшыня ТБМ Алег Трусаў лічыць, што затрымка была невыпадковаю.

«Гэта, мабыць, зьвязана з тым, што статыстыка, якую яны нам падалі, вельмі трывожная. Працэсы зьмяншэньня колькасьці дзяцей, якія навучаюцца па-беларуску, цяпер паскорыліся намнога хутчэй, чым у папярэднія гады. Было па палову адсотка за год, а цяпер – амаль два адсоткі. Маем спад вельмі вялікі і найбольшы ён у гарадах», - пацьвердзіў Алег Трусаў.

У цэлым па краіне па-беларуску сёлета навучаецца 18,4 адсотка ад агульнай колькасьці школьнікаў. У першых жа клясах па-беларуску вучыцца 16,7 адсотка, а ў гарадох гэтая лічба складае толькі 1,9 адсотка. Нагадаем, што ў 1993-94 навучальным годзе за парты беларускамоўных клясаў і школаў села 76 адсоткаў першаклясьнікаў. У Менску беларускамоўнымі былі 58,6 адсотка першаклясьнікаў. Высновы з такой статыстыкі ў Алега Трусава пэсымістычныя.

«У пэрспэктыве, калі нічога ня зьменіцца, то гэта – поўнае паміраньне гэтага школьніцтва. Чаму? Таму што працэс зьнікненьня вёскі непазьбежны, і калі мы беларускамоўны горад страцім, то мы паступова страцім і дзяржаву, і незалежнасьць», - робіць выснову старшыня ТБМ.

«Мы спадзяемся, што грамадзкія актывісты, перш-наперш тыя, якія лічаць сябе прадстаўнікамі вольнай супольнасьці, пачнуць справу па стварэньні беларускамоўных клясаў ужо цяпер, не чакаючы лета, калі ўсе будуць у адпачынках. Трэба цяпер ужо зьбіраць заявы і перадаваць іх у адміністрацыі сваіх гарадоў і вёсак, каб людзі загадзя бачылі становішча з гэтым. Ну і канечне, касьцяком гэтых клясаў павінны быць дзеці і ўнукі дэмакратычных актывістаў, тых жа сяброў АГП, БНФ, Грамады і гэтак далей. Разам яны складаюць немалую колькасьць», - працягвае Алег Трусаў.

Калі ж гэтага цяпер не зрабіць, дадае кіраўнік ТБМ, то празь пяць, сама болей сем гадоў у Беларусі не застанецца беларускамоўных школьнікаў.

Відавочна, што беларуская адукацыя зможа адрадзіцца толькі пасля зьмены палітычнага рэжыму ў Беларусі.

## Рэдактары незалежных мэдыяў: «З намі гуляюць, як зь лялькамі»

У дзяржаўны продаж вярнулі «Народную волю», на чарзе і тыднёвік «Наша Ніва». Але іншых незалежныя выданьні працягваюць знаходзяцца ў няроўных умовах зь дзяржаўнымі СМІ.

Тыднёвік "Свободные новости" яшчэ шэсьць гадоў таму быў выкінуты з падпіснога каталёгу "Белпошты". Выданьню цудам удалося захаваць адносіны зь "Белсаюздрукам", і таму прадаюць газэту ўсё ж у шапіках гэтай дзяржаўнай структуры, паведамляе "Радыё Свабода".

Аднак калі б не абмежаваньні ў падпісцы, сёньняшні тыраж у 22 тысячы даўно б ужо значна вырас, мяркуе рэдактар Васіль Зданюк. У верасьні, згадвае рэдактар, ён зьвяртаўся зь лістом у "Белпошту", каб "Свободные новості" вярнулі ў падпіску, але нават не атрымаў адказу. Тое, што "Народнай волі" і "Нашай Ніве" такі дазвол далі, рэдактар успрымае як добры знак.

"Калі беларускія ўлады будуць пасьлядоўнымі, то, спадзяюся, наступны крок будзе такі, што і адносна іншых выданьняў вырашыцца праблема з распаўсюдам і друкам. Вельмі спадзяюся, што гэта першы крок, за якім будуць наступныя", - кажа Васіль Зданюк.

Рэдактар "Свободных новостей" вітаў дзейнасьць Беларускай асацыяцыі журналістаў, якая, паводле яго, адстойвае інтарэсы незалежных выданьняў перад афіцыйнымі ўладамі.

Асабліва ў цяжкім стане з-за абмежаваньняў у падпісцы і распаўсюдзе апынуліся рэгіянальныя выданьні. Тыднёвік "Вольнае Глыбокае" тры гады таму меў наклад 3,5 тысячы, цяпер — толькі 2100. Паводле рэдактара Ўладзімера Скрабатуна, "Вольнае Глыбокае", якое любяць і ў суседніх раёнах, стала вельмі цяжка распаўсюджваць. Прыкладам, у Шаркаўшчынскім ды Мёрскім раёнах, паводле рэдактара, прадаўцоў газэты міліцыя затрымлівае, хаця ў іх ёсьць усе патрэбныя дакумэнты. Уладзімер Скрабатун ня верыць у тое, што "лібэралізацыя" ў галіне недзяржаўных мэдый пойдзе далей за "Народную волю" і "Нашу Ніву".

"Мне адзін дзядзька з канторы, якая ўсе ведае — разумееце, зь якой? Што на тры літары — сказаў: газэта "Вольнае Глыбокае" занесеная ў адмысловы сьпіс апазыцыйных выданьняў, у які трапляюць сур'ёзна і надоўга", - сказаў Уладзімер Скрабатун "Радыё Свабода".

Паводле яго, у мясцовых установах “Белпошты” і “Белсаюздруку” зацікаўленыя ў вяртаньні “Вольнага Глыбокага”, бо гэта дапаможа выконваць плян, але на абласным узроўні справа тармозіцца.

Баранавіцкае выданьне “Intex-press” выходзіць накладам большым за 16 тысяч, у рэгіёне газэта — адна з самых папулярных. Рэдактар Уладзімер Янукевіч мяркуе, што нават дазвол уладаў на вяртаньне газэты ў агульную сыстэму продажу і падпіскі ня выправіць сытуацыю няроўнасьці дзяржаўных і недзяржаўных мэдый.

“Намі гуляюць, як лялькамі, а грунтоўна пытаньне не вырашаецца. 8 лютага ўступіць у дзеяньне новы закон, які яшчэ горшы. А тое, што кагосьці вяртаюць у распаўсюджваньне, дык празь некалькі месяцаў гэтак жа лёгка могуць зноў выкінуць. Таму добрая навіна, але нават ня крок, не палова, а толькі чвэрць кроку да таго, каб свабода слова пачала панаваць у Беларусі”, - мяркуе Уладзімер Янукевіч.

**Крыніца:** Хартыя 97, 27 лістапада 2008

## Беларуская гісторыя па-летувіску

**Кірыл Касьцян**

*Кожная краіна мае сваю гісторыю і адпаведную яе інтэрпрэтацыю спрабуюць данесьці да іншых. Адным краінам гэта ўдаецца, а іншыя прымаюць вымушаныя прымаць чужую вэрсію . Беларусь у дадзены момант належыць да другое катэгорыі. Яскравым прыкладам гэтаму сталася інфармацыя беларускіх мэдыяў аб музычным фэсьце “Be2gether”, які мусіць адбыцца ў сярэдзіне жніўня на беларуска-летувіскім памежжы.*

22 ліпеня 2008 на найбуйнейшым беларускім партале “TUT.BY” зьявілася навіна абвестка пад назовам “Уникальное культурное событие на границе Литвы и Беларуси”[hyperlink: http://news.tut.by/113385.html]. Нататка прысьвячалася музычнаму фэсту “Be2gether”, які адбудзецца каля замку ў Нарвілішках, што ляжыць на летувіскай тэрыторыі пры мяжы зь Беларусяй.

Гэты безумоўна цікавы фэст ёсьць цудоўным прыкладам памежнае супрацы паміж Беларусяй і Летувой. Згодна з абвесткай, гасьцём фэсту будзе прапанаваная цікавая культурніцкая праграма, якая, пэўна, задаволіць якія-колечы густы.

Аднак, асаблівае ўвагі варта першая частка тэксту, прысьвечаная мясцовасьці, дзе мае адбыцца фэст. Зь яе мы даведваемся пра “багатага ўсходне-прускага купца Вайцекуса Шорцаса”, што пабудаваў Нарвілiскі замак у пачатку 16 стагодзьдзя. “Мясцовая прыгажуня графіня Дарата Зяновічутэ” стала ягонай жонкай і дзеля яе “гэты адважны ваяр застаўся ў Вялікім княстве Літоўскім”. Далей мы даведваемся, што “Вайцекус Шорцас” загінуў на вайне і па ягонай сьмерці “Дарата Зяновічутэ-Вайтэкенэ-Шорцэнэ запрасіла зь Вільнюсу францішканцаў”, якія атрымалі замак у падарунак.

Здавалася-б, што гэтая пранікнёная гісторыя каханьня ня мусіць выклікаць аніякіх нэгатыўных рэакцыяў чытачоў, адно ствараць рамантычны настрой у будучых гасьцёў фэсту. Аднак, варта адцеміць, што ў тэксьце ідзецца пра 16 стагодзьдзе, калі летувiская мова ня тое што ня мела якога-колечы афіцыйнага статусу, але і практычна не існавала ў пісьмовым выглядзе. Больш за тое, Вялікае княства Літоўскае ў інтэрпрэтацыі навіны падаецца як летувіская дзяржава. Нагадаем, што дзяржаўнай мовай ў тыя часы ў Вялікім княстве была старабеларуская, і ў аніводным дакумэнце тых часоў мы ня знойдзем аніякіх “Вільнюса”, “Вайцекуса Шорцаса” і тым больш “Дараты Зяновічутэ”, якая ў выглядае як этнічная летувіска.

Пра род Зяновічаў, аднак, мы можам даведацца з кнігі Паўлы Ўрбана “Ў сьвятле гістарычных фактаў”[hyperlink: http://knihi.com/urban/fakty.html], дзе ён піша, што “*Паны Зяновічы – праваслаўныя ды паходзілі з Полаччыны. У акце 1401 году згадваўся пан Братоша й ягоны сын Зянові. Братоша быў панам-радцам у вялікага князя Вітаўта, а як склаўся жыцьцёвы шлях ягонага сына - няведама... Паны Зяновічы не зыходзяць зь дзяржаўна-палітычнае арэны і ў XVI стагодзьдзі. Прыкладам, у другой палове гэтага стагодзьдзя пан Крыштоп Юравіч Зяновіч быў кашталянам берасьцейскім, а пан Юрай Мікалаевіч Зяновіч - намінальным кашталянам смаленскім.*”.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ніякай летувіскі “Дараты Зяновічутэ-Вайтэкенэ-Шорцэнэ” ніколі не існавала, але была ліцьвінка (беларуска) паводле паходжаньня Дарота Зяновіч.

Гэтая абвестка-навіна ёсьць чарговым прыкладам спробы распаўсюдзіць летувіскую вэрсію бачаньня беларускае гісторыі на беларускае грамадзтва, якая адбываецца рукамі саміх беларусаў. Крыўдна ня тое, што такія тэксты зьяўляюцца, а тое, што на іх зьяўленьне аніхто аніяк не рэагуе. З такім падыходам беларусы хутка аддадуць тое, што яшчэ хоць неяк атасамляецца зь Беларусяй і наступнае пакаленьне беларускай нацыі будзе зь беларускіх жа падручнікаў будзе ведаць Барбару Радзівілянку як “Барбору Радвілайтэ”, а Соф’ю Гальшанскую як “Зафію Альшэнішке”, лічачы іх этнічнымі летувіскамі.

## Два студэнты стварылі электронную энцыкляпэдыю Беларусі

Студэнт БДУ Аляксей Кульбіцкі ды студэнт Радыётэхнічнага ўнівэрсытэту Мікалай Дзятлаў канчаюць працу над унікальнай электроннай энцыкляпэдыяй па гісторыі ды культуры Беларусі. Ня кожная краіна сьвету можа пахваліцца такім электронным даведнікам. А пачалі працу над праграмай Аляксей ды Мікалай яшчэ два гады таму, калі канчалі школу.

Аляксей, распавядзіце, калі ласка, у чым сэнс створанай вамі праграмы «Спадчына», што яна зьмяшчае?

**А. Кульбіцкі:** «Спадчына» – гэта электронны даведнік па гісторыі ды культуры Беларусі. Праграма складаецца з разьдзелаў «Інфармацыя», «Экскурсыі», «Выявы», «Вайсковая справа», «Літаратура» ды іншых. Тут можна знайсьці сьціслы курс па гісторыі Беларусі, мапы нашай краіны ад часоў Полацкага Княства да сучаснасьці, шмат экскурсій, якія распрацаваныя намі, каб заахвоціць беларусаў і замежнікаў вандраваць па нашай краіне,

аглядаць нашыя помнікі архітэктуры. Апроч таго, тут ёсьць аб'ёмныя 3D-мадэлі помнікаў архітэктуры. Гэта зроблена для таго, каб чалавек, які ня бываў, скажам, у Мірскім замку, змог, седзячы за кампутарам, паглядзець яго з усіх бакоў на сваім маніторы.

— Мікалай, наколькі тэхнічна складана было стварыць такую цікавую праграму?

**М. Дзятлаў:** Ведаеце, даволі складана, бо тут ужытыя ўсе сучасныя кампутарныя тэхналёгіі. Па сканчэньні працы мы плянуем выдаць праграму на дысках. Чаму на дысках? Бо гэта зручней за сайт. На сайце будуць паменшаныя здымкі, туды ня выкладзеш вялікае відэа, гукавыя файлы. Ня ўсе маюць хуткасны інтэрнэт, таму гэта проста бессэнсоўна. А праграма займае каля 700 мэгабайтаў, таму дыск – самы зручны варыянт.

— Адкуль у вашым юным веку такія тэхнічныя веды?

**М. Дзятлаў:** Мы разьвіваліся разам з праграмай. Напачатку, як я зараз магу сказаць, зусім нічога ня ведалі. Але калі ўзьнікалі нейкія цяжкасьці, мы спрабавалі іх вырашыць, вучыліся, дасканаліліся, каб зрабіць гэтую праграму больш прыладнай для працы. І магу сказаць, што ў нас атрымалася зрабіць добры інтэрфэйс, які будзе зразумелы нават нявопытнаму карыстальніку. У часе працы нам давялося засвоіць шмат новага: праграмы Flash, 3d-max, мовы праграмаваньня…

— Аляксей, ствараць гэтую праграму вы пачалі яшчэ ў школе. Што сталася штуршком?

**А. Кульбіцкі:** Усё пачалося з таго, што недзе клясе ў 10-й мы зь Мікалаем пачалі цікавіцца гісторыяй. Гэтаму спрыялі цікавыя школьныя ўрокі, а таксама нашыя супольныя вандроўкі па гістарычных мясьцінах Беларусі. Вандруючы, мы зразумелі, што такога вось электроннага даведніка папросту няма. А здорава было б яго мець! Вось мы нясьціпла й вырашылі запоўніць гэты прагал.

— Аляксей, наколькі я разумею, ствараючы гэтую праграму ў школе, вы перасьледавалі яшчэ й мэту без іспытаў паступіць ва ўнівэрсытэт. І гэта Вам удалося?..

**А. Кульбіцкі:** Напраўду, узьніклі пэўныя перашкоды. Мы хацелі падаць праграму на ўсебеларускія алімпіяды па гісторыі ды праграмаваньні. І калі б мы здабылі якое прызавое месца, дык безь іспытаў паступілі б ва ўнівэрсытэты. Але нашае месца было толькі трэцім, першую прэмію здабыла нейкая дзяўчына з «ідэалягічна правільным» праектам пра «Лінію Сталіна»… А мы зь Мікалаем усё адно самастойна паступілі ў ВНУ.

— А вы, Аляксей, што новага адкрылі й здабылі ў часе стварэньня праграмы?

**А. Кульбіцкі:** У часе працы я, можна сказаць, абраў сваю будучую прафэсію. Бо калі раней я вагаўся між некалькімі варыянтамі, дык тут пэўна вызначыўся, што хачу займацца кампутарным дызайнам ды графікай.

— Аляксей, ці быў у вас нейкі дарадца ў часе стварэньня «Спадчыны»?

**А. Кульбіцкі:** У тэхнічным пляне нашымі рэцэнзэнтамі й дарадцамі былі нашыя школьныя настаўнікі, а таксама кнігі, якія можна набыць у любой кнігарні. У гістарычным пляне зноў жа дапамагалі настаўнікі, а таксама наш знаны пісьменьнік-гісторык Уладзімер Арлоў.

— Аляксей, калі чакаць выхаду праграмы ў тыраж?

**А. Кульбіцкі:** Думаю, што мы зробім такі падарунак беларусам да Новага году!

**Арцём Багданаў,** Беларуская рэдакцыя Польскага

## Беларусы Эўразьвязу

### Беларусь у Познані

24 лістапада, у 17.00 у галерэі Арсэнал адбылося адкрыцьцё выставы беларускіх мастакоў: Юры Якавенкі, Аляксандра Сільвановіча і Уладзіміра Блюдніка. Юры Якавенка, прыляцеўшы адмыслова на адкрыцьцё выставы з Рыму, прэзэнтаваў свае графікі і дыхтоўна выдадзены каталяг сваіх працаў. Аляксандар Сільвановіч, пасьля амаль месячнага побыту ў Польшчы, удзелу ў шматлікіх пленэрах і выставах прэзэнтаваў сэрыю карцінаў, аб'яднаную легендамі і сымбалямі старажытнасьці. Уладзімір Блюднік прадставіў свае алейныя палотны і літаграфіі апошніх гадоў.

24 лістапада, у 19.00 у славутым джэзавым клюбе „Blue Note" прайшоў канцэрт 'Народныя гукі Беларусі' (Паліна Зузіна - сьпеў, Вадзім Швэд - гармонік). Выступ сабраў поўны зал зацікаўленых слухачоў, якія падзяліліся на тых хто добра ведае беларускі фальклёр і тых для каго гэты канцэрт стаўся сапраўднай эгзотыкай. Пад канец выступу і адныя і другія зьліліся ў адзіную разбаўленую і прыхільную публіку.

25 лістапада, у 14.000 у галерэі Арсэнал адбылася літаратурная прэзэнтацыя, у якой удзельнічалі: Юры Гумянюк, Віталь Воранаў, Уладзімір Блюднік, Давід Юнг. Паэт з Гародні Юры Гумянюк прачытаў польскія пераклады сваіх вершаў, а таксама цалкам новыя вершы, якія ўвойдуць у плянаваны томік паэзіі. Мастак і паэт Уладзімір Блюднік прэзэнтаваў новавыдадзеную дэбютную кнігу „Вяртаньне", якая наконадні выйшла ў выдавецтве 'Белы Крумкач', у Познані. Паэт, опэрны сьпявак і рэдактар часопісу 'Паэтычныя Сшыткі' з Гнезна, - Давід Юнг апавёў пра ход працы над польскай анталёгіяй беларускай паэзіі, якая мае выйсьці ў 2009 годзе. Віталь Воранаў правёў прэзэнтацыю выдавецкай сэрыі 'Белы Крумкач', а таксама прачытаў свае пераклады вершаў Алеся Аркуша і Давіда Юнга. Пасьля прэзэнтацый адбылася размова, якую правёў літаратуразнаўца праф. Багуслаў Бакула. На заканчэньне гледачы змаглі набыць новыя выданьні: альманах 'Беларус 2008' выдадзеным у Нью-Ёрку, у якім прадстаўленыя творы ажно трох познаньскіх аўтараў, 'Віня-Пых' Алана Мілна, 'Вяртаньне' Уладзіміра Блюдніка, а таксама мастацкія каталягі Ю. Якавенкі і А. Сільвановіча.

Арганізатарамі беларускай часткі дзён славянскай культуры выступілі Унівэрсытэт ім. Адама Міцкевіча і Беларускі культурна-асьветніцкі цэнтар у Познані.

# „Галярэя Ады“ у Вільні

У Вільні, 27 сьнежня 2008 г., у Таварыстве Беларускай Культуры ў Літве ў чарговы раз сустрэліся беларусы, каб адзначыць Каляды і Новы Год і павіншаваць адзін аднага са сьвятамі. Галоўнай падзеяй сустрэчы была прэзентацыя ўжо вядомага ў Беларусі і сьвеце дакументальнага фільма Уладзімера Коласа пра грамадзкую актывістку Аду Райчонак „Галерэя Ады“ з удзелам самой гераіні.

Перад прэзентацыяй стужкі адбыўся пазачарговы сход ТБК, дзе разглядалі арганізацыйныя пытаньні адносна стварэньня беларускага культурнага цэнтра Якуба Коласа ў Вільні. Так, доўгія дваццаць год змаганьняў урэшце рэшт прынясьлі свой плён (відаць, ужо ніхто ў гэта не верыў), і музей-цэнтр класіка беларускай літаратуры пачынае сваё існаваньне. Безумоўна, галоўнае наперадзе: гэта і зьбіраньне і адваяваньне ў іншых музеяў экспанатаў, гэта і пабудова будынку, пошук грашовых сродкаў і ахвярадаўцаў, - але справа па ўвекавечваньні памяці песьняра на Віленшчыне зрушылася і стала не прывідам а рэальнасьцю. Аддаць належнае варта старшыні ТБК, паважанаму Хведару Нюньку, які ўвесь гэты доўгі час вёў зацятае змаганьне за адкрыцьцё музея, і не страціўшы надзеі, перамогшы ўсе непаразуменьні і перашкоды, зьдзейсніў сваю чарговую мару па захаваньні беларускасьці ў Літве.




У госьці быў запрошаны ўкраінскі ансамбль “Світлиця” , які павіншаваў беларусаў са сьвятамі і прасьпяваў калядкі на ўкраінскай мове. Вельмі прыемны момант, што ў Таварыства ўсталёўваюцца з гэтым ансамблем і сябрамі ўкраінцамі цёплыя адносіны. Гэта ўжо не першае выступленьне ў ТБК. Яны ж выступалі і на сьвяточным канцэрце, прысьвечаным 90-годдзю абвяшчэньня БНР у Вільні.

Ну і вядома ж, як і пісалася ў пачатку, самай галоўнай падзеяй вечарыны была прэзентацыя стужкі „Галерэя Ады“. Варта адзначыць, што гэты фільм заваёўвае ўсё большую і большую папулярнасьць: ён атрымаў галоўную ўзнагароду на VIII Міжнародным фэстывалі крэатыўных дакумэнтальных фільмаў «Escales Documentaire» у францускім горадзе Ля-Рашэль. Але гэта была не адзіная перамога! Перад гэтым на тэлефэстывалі «Залаты бубен» у Ханты-Мансійску (Расея) стаў лаўрэатам у катэгорыі «Нацыянальны характар», а 24 кастрычніка 2008 г. заняў першае месца ў катэгорыі “Найлепшы рэгіянальны нізкабюджэтны дакумэнтальны фільм” на конкурсе «Europa Prix» у Бэрліне.

Аб стварэньні фільма, аб тых цяжкасьцях, зь якімі стваральніка сутыкаліся, калі ён нараджаўся апавядалі рэжысёр і аўтар Уладзімір Колас і галоўная гераіня Ада Райчонак, якая крыху распавяла пра сябе, пра свой нялёгкі жыцьцёвы шлях, пра тое, што яе зьвязвае з Вільняй і беларусамі гэтага Вечнага Гораду.

Фільм аб ёй, вясковай настаўніцы, якая пад час Другой сусьветнай вайны выжыла ў Віцебскім гета, сёньня ў звычайнай вёсцы Германавічы (былым мястэчку), што на Шаркаўшчыне, займаецца культурніцкай дзейнасьцю. Гэтая стужка перад усім аб лёсе чалавека, аб яго супрацьстаяньню зьнешняму асяроддзю і непаразуменьню зь ім, аб тым, што чалавек у любой сітуацыі можа рабіць прыгожае, велічнае, калі ён гэтага пажадае; яна і аб тым, як чалавек зламаны жыццём і абставінамі можа падымацца, і ісьці далей, несучы ў гэтае шэрае і змрочнае вясковае жыцьцё нешта іншае, больш значнае, чым інстыктыўнае існаваньне жыцьця ад заробку да заробку і мая хата скраю, і ў чарговы раз сьведчачы аб вечнасьці і непераможнасьці мастацтва.

Праглядаючы стужку, мы пераносімся ў звычайную вёску, з яе бытам, праблемамі, радасьцямі... Бачым чалавека з глыбінкі і што яго хвалюе. І на фоне гэтага яна, былая настаўніца, ўкліньваецца ў гэтае стандартнае існаваньне і спрабуе яго зьмяніць.

Ада Райчонак стала стваральніцай чатырох музеяў - гэта вялізны ўклад у захаваньне спадчыны ў рэгіёне. Яна займаецца грамадзкай дзейнасьцю. І вось апошнія 15 год праводзіць мастацкія пленэры. Адзін з такіх пленераў 2007 г. і пакладзены ў аснову сюжэта стужкі. І тут аўтар вельмі ўдала спалучае две лініі, жыцьцё сялян, іх быт, і творчую інтэлегенцыю, у адну. Тут яны перасякаюцца і цягам гадзіны вядуць сваё супольнае суіснаваньне і сутыкаючыся адзін з адным і паказваюць найбольш вострыя праблемы сёняшняй беларускай глыбінкі і яе насельнікаў і іх канфлікт з сьветам культуры, мастацтва (іншага, чужога ім сьветапогляду). І гераіня фільма спрабуе прымірыць гэтыя дзьве лініі, хоча, каб вёска вырвалася са свайго незразумела якого існаваньня і адчула, што сьвет не замыкаецца мястэчкам, каровамі, сьвіньнямі, а ёсьць яшчэ іншае – галерэя Ады, свет мастацтва і прыгожага, які ўказвае чалавеку на яго годнасьць і велікасьць пакліканьня на гэтай зямлі, і што будзённае і шэрае можа быць прыгожым. Трэба гэта толькі зразумець.

*Алесь Адамковіч*

---

# Упяршыню - Дзяды ў Швэцыі



1 лістапада беларусы Стакгольму першы раз выправіліся на Дзяды на магілкі прадмесьця Густаўбэрг, дзе спачывае Васіль Лукашык (1911-1975) – выхаванец Віленскага ўнівэрсытэту, былы дзеяч Грамады, заснавальнік першай беларускай суполкі ў Скандынавіі (1948). Пасьля ўпарадкаваньня помніка ды апавяданьня пра жыцьцё спадара Лукашыка (Андрэй Катлярчук) адбыўся невялікі памінальны абед. Спадзяюся, што традыцыя сьвяткаваньня Дзядоў ў Швэцыі працягнецца.

**Радыё Рацыя**, 2 лістапада 2008

## Чэская паэзія
## ў перакладах Віталя Воранава

**Віталь Воранаў** - літаратар, перакладчык, выдавец. Нарадзіўся 18 сакавіка 1983 г. у Менску. Сузаснавальнік і старшыня Беларускага культурна-асьветніцкага цэнтру ў Познані і выдавецтва Белы Крумкач.

Студэнт Унівэрсытэту імя Адама Міцкевіча ў Познані (Польшча) і Заходнячэскага Ўнівэрсытэту ў Пльзені (Чэхія).

Пераклаў наступныя творы з ангельскае мовы на беларускую: У чаканьні Гадо - Самюэля Бэкета ды Віня-Пых Алана Мільна.

Ягоны твор Дзядзька Мікола быў зьмешчаны ў Но.5 газэты КРЫВІЯ.

Сп. Воранаў стала жыве ў Польшчы. У 2008 г. пачаў магістарскія студыі ангельскай мовы й літаратуры на ўнівэрсытэце Т.Г. Масарыка ў Брне (Чэхія).

Мае свой асабісты сайт у інтэрнэце - www.voranau.com"

---

### Юзік Пузік (Jožin z bažin)
Ivan Mládek

Еду значыць адпачыць
Аўдзі сто ў Ясельду
Цісну газ каб па шашы
Прашмыгнуць праз слабаду
Тут лютуе ваўкалюд
Дом ягоны балаты
Жэрці любіць гарадзкіх
І тых што без барады

Юзік Пузік
Па Палесьсі ходзіць
Юзік Пузік
Туды сюды бродзіць
Юзік Пузік
З радасьцю замучыць
Юзік Пузік
Б'е, грызе і душыць
На страшыдлу Юзіка
Гэта будзе для ўсіх шок
Дзеіць толькі і выключна
Танны пральны парашок

Заяжджаю па гравейцы
Ў вёску Чарнеевічы
Старшыня там павітаў
І наліў гарэліцы
Жывага ці мёртвага
Юзіка хто прывядзе
З тым дачушку ажаню
Аградом дам у сяле

Юзік Пузік
Па Палесьсі ходзіць
Юзік Пузік
Туды сюды бродзіць
Юзік Пузік
З радасьцю замучыць
Юзік Пузік
Б'е, грызе і душыць
На страшыдлу Юзіка
Гэта будзе для ўсіх шок
Дзеіць толькі ды выключна
Танны пральны парашок

Дай кажу я старшыні
Парашок і трактар
Юзіка я прывяду
Зробім з вамі гандаль
Старшыня мяне паслухаў
Трактар даў, фарсунку
На страшыдлу Юзіка
Хопіць мне рыштунку

Юзік Пузік
Цэленькі ўжо белы
Юзік Пузік
Дзёру даў праз мелі
Юзік Пузік
Ляпнуўся аб камень
Юзік Пузік

---

### Morituri Te Salutant
Karel Kryl

Шлях гэта пыл
і жвір
і зьбіўшаяся гліна
сівыя смугі
крэсьліць у валасах
з зорных дарог
рубін
што каменем падбіты
а пёркі суму
з крылаў зьняў Пэгас

Шлях гэта біч
ён злы
як вулічная дама
у пальцах шворкі
туфлі на цьвіках
з вачніцаў юр зіхціць
калі кідае марна
зламаныя пялёсткі
гвазьдзіка

Сяржант, пясок будзе белы
як рукі Даніэлы
Дайце тры хвілі!

Каб вочы даглядзелі
забытай даўна
гісторыі падзеі
Сяржант! Махнуць нам
і станемся сьвятымі
Morituri te salutant
Morituri te salutant

Шляхам у даль
ішоў
туды дзе жах аблогі
пяском віхурыць
голуба крыло
а марс іграў
з гармат
каб не трасьліся ногі
хто ўзносіў пёркі
пер'ем замяло

Шлях гэта смоль і пыл
і зьбіўшаяся гліна
мядзяны чмель
ад переварытня
з іржой наган
- браток
і векавая міна
агідны цень
ад гора воблака

Сяржант, пясок будзе белы
як рукі Даніэлы
Дайце тры хвілі!

Каб вочы даглядзелі
забытай даўна
гісторыі падзеі
Сяржант! Махнуць нам
і станемся сьвятымі
Morituri te salutant
Morituri te salutant

## Дасягнута дамоўленасьць аб пашырэньні ўжытку беларускай мовы на тэлебачаньні

На сустрэчы старшыні "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" Алега Трусава со старшынём Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Аляксандрам Зімоўскім 27 студзеня дасягнута дамоўленасьць аб пашырэньні ўжытку беларускай мовы на айчынным тэлебачаньні. Пра гэта паведаміў БелаПАН А.Трусаў.

Паводле яго слоў, на сустрэчы, якая адбылася з ініцыятывы старшыні ТБМ, былі разгледжаны сем прапаноў кіраўніцтву НДТРК.

Як зазначыў А.Трусаў, бакі прышлі да згоды па пяці пунктах: заснаваць 10—15-хвілінную перадачу "Гаворым па-беларуску"; стварыць цыкл перадачаў на беларускай мове на гістарычную тэматыку, прычым першы цыкл прысвяціць 600-годдзю перамогі беларусаў у складзе войскаў Вялікага княства Літоўскага ў Грунвальдскай бітве; сумесна з Інстытутам мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАНБ зрабіць перадачу, прысьвечаную 10-м угодкам Міжнароднага дня роднай мовы, заснаванага паводле рашэньня ЮНЕСКА; раз у месяц ладзіць на тэлебачаньні тэматычныя круглыя сталы па пытаньнях беларускай мовы і культуры з удзелам грамадскіх арганізацый, у тым ліку ТБМ, Таварыства беларускай школы і Згуртаваньня беларусаў свету "Бацькаўшчына"; аднавіць дубляж замежных фільмаў на беларускую мову з далейшым паказам на айчынных тэлеканалах.

Разам з тым, паводле слоў старшыні ТБМ, дзьве прапановы аб'яднаньня (Першы нацыянальны канал Беларускага тэлебачаньня ў перспектыве цалкам зрабіць беларускамоўным, а беларускамоўную рэкламу даваць па крыху меншым кошце, чым рускамоўную), на думку А.Зімоўскага, патрабуюць асобнага разгляду.

Размова адбывалася на дзяржаўнай беларускай мове, зазначыў А.Трусаў. "Спадар Зімоўскі паабяцаў аформіць па-беларуску частку сувеніраў тэлерадыёкампаніі", — паведаміў старшыня ТБМ, паведамляе БелаПАН

**Крыніца:** Радыё Рацыя, 27 студзеня 2009 г.

## Чэская паэзія ў перакладах Віталя Воранава - працяг

### Сьвятло Сараева
Jaromír Nohavica

Паўз абшар галіцкі вые вецер злы
рэчы што мы мелі з вадою паплылі
як вандроўны статак быццам птушак сны
мы ляцім у далі два сінія лісты

Не згараюць дровы ня стыне нутро
але час ісьці ўжо спаць
за пагоркам гэным Сараева сьвятло
там заўтра будзем шлюб з табою браць

Пробашч у сьвятыні нас зьвяжа на вякі
кветкі тамарыску дакіне да ракі
рака назад увальлецца ў мора берагі
мы двое тут унізе і неба ў гары

Не згараюць дровы ня стыне нутро
але час ісьці ўжо спаць
за пагоркам гэным Сараева сьвятло
там заўтра будзем шлюб з табою браць

З нашых пекных сноў пабудую дом
з дуба будзе ён і белых камянёў
ведае хай кожны як цябе любіў
будзе ён навекі стаяць а мы ў ім

Не згараюць дровы ня стыне нутро
але час ісьці ўжо спаць
за пагоркам гэным Сараева сьвятло
там будзем шлюб мая галубка браць

### Як бралі мяне ў салдаты
Jaromír Nohavica

Як бралі мяне ў салдаты
абстрыгалі пад гаршчок
выглядаў я як балда
як і ўсе што навакол-ол-ол-ол
як і ўсе што навакол

Загналі мяне ў казарму
пачалі мяне вучыць
як радзіму бараніці
як салдатам добрым быць быць быць быць
як салдатам добрым быць

Неяк ранкам на сьвітанку
абапёрся аб сьцяну
прыгадаў сваю галубку
дужа я яе люблю-лю-лю-лю
дужа я яе люблю

У адведкі праз паў году
завітала, я ж хварэў
калідорам нехта сноўдаў
я нічога не пасьпеў сьпеў сьпеў спеў
я нічога не пасьпеў

Плакаць тут ня мае сэнсу
гэта ж не яе віна
дзеўцы трэба даць любові
усё астатняе лухта-та-та-та
усё астатняе лухта

У маёра на пагонах
зорка быццам бы зьвязда
каля брамы дзеўку пераняў
вось і здарылась бяда-да-да-да
вось і здарылась бяда

Што каму там да салдата
калі дзеўка здрадзіла
покуль вам Кузьма Батура
песьня тут закончана-на-на-на
як па густу вам яна-на-на-на
асаблівай ня была

**КРЫВІЯ - Культурна-асьветніцкая газэта**
Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі
MK ČR E 16919

РЭДАКЦЫЯ
Юрка Станкевіч
Ганна Васілевіч

Адрас рэдакцыі:
ul. Ostrovského 253/3, 150 00 Praha 5
Тэл.: 774 613 356